# «ЗЯЛЁНАЕ ЖНІВО» ПАЛЕСКІХ РУПЛІЎЦАЎ

## У Пінскім раёне робяць акцэнт на якасці кармоў

**Пінскі раён уваходзіць у зону так званага «рызыкоўнага земляробства», патлумачылі ў райвыканкаме. Гэта значыць, што раптоўныя замаразкі, засухі ці нават перапады тэмператур робяць сельгаспадарчую дзейнасць на гэтай тэрыторыі нестабільнай. Начныя замаразкі бываюць у маі ці нават напачатку лета, а вяртанне холаду можа загубіць парасткі. Ды і землі, што перажылі меліярацыю, патрабуюць асаблівага падыходу. А касавіца — той час, калі закладваецца кармавая база на ўвесь год.**





Аграпрамысловы комплекс — аснова эканомікі раёна: Піншчына дае больш за

ажыццяўляўся, — палепшыць уласную кармавую базу прадпрыемства. Трава скош-

(110-120 тысяч тон, каб быў пераходны фонд) і на зерне (не менш за 10 тысяч тон трэба намалаціць). Але ўпор робім на шматгадовыя травы і люцэрну (яна ўтрымлівае значна больш бялку, таму з'яўляецца асновай для вытворчасці высокапажыўных гранул). Таму заўсёды імкнёмся максімальна выкарыстаць прыдатныя ўмовы надвор'я, каб не дапусціць перастою траў. Косім, правяльваем, здрабняем, пас-

Сёння ў гаспадарцы завяршаюць першы ўкос. Дзеля гэтага была задзейнічана ўся сучасная тэхніка: сем комплексаў машын-здрабняльнікаў, 26 ці 28 МАЗаў (у залежнасці ад патрэбы) і 10 трактароў для вывазу сыравіны. Не толькі ад тэхнікі, але і ад людзей, якія ёю кіруюць, залежыць якасць нарыхтоўкі кармоў.

— Мы зацікаўлены, каб людзі працавалі і зараблялі, — падкрэслівае Аляксандр Пікун. — Заробак у нашай гаспадарцы адзін з найлепшых сярод аграрыяў краіны.

Касавіца ў ААТ «Парахонскае» — гэта адпрацаваны працэс, дзе ўлічваюцца прыродныя рытмы, спалучаюцца традыцыйныя і навуковыя падыходы, далучаецца перадавая тэхніка. Добрая арганізацыя дазваляе своечасова скошваць травы, здрабняць, пры вытворчасці сенажу — правяльваць і ўшчыльніць, а пасля запакаваць у траншэі пад плёнкай у кароткія тэрміны. Альбо накіраваць свежаскошаную зялёную масу на штучную сушку пры высокай тэмпературы для далейшага спрэсоўвання ў гранулы — такім чынам захоўваецца да 90 працэнтаў каштоўных рэчываў летніх траў. Штогод сельгаспрадпрыемства забяспечвае ўласнымі кармамі шматтысячны статак — а гэта шэсць малочна-таварных і сем адкормачных комплексаў. Такім чынам да

Аграпрамысловы комплекс — аснова эканомікі раёна: Піншчына дае больш за восем працэнтаў валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі Брэсцкай вобласці. Таму з асаблівай адказнасцю (і з улікам спецыфікі рэгіёна) падыходзілі і да ўдзелу ў інвестыцыйнай праграме «Адзін раён — адзін праект». Дзякуючы ёй штуршок для далейшага развіцця атрымала адно з вядучых сельгаспрадпрыемстваў Беларусі — ААТ «Парахонскае». «Гэта ўзорная гаспадарка ў нашым раёне, што адзначыў нават Прэзідэнт, — звярнуў увагу **Дзмітрый ГУЗАРЭВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Пінскага райвыканкама.** — Яе дырэктар Уладзімір Фёдаравіч Храленка пастаянна накіраваны на пашырэнне магчымасцяў і развіццё прадпрыемства» .

Па-сутнасці гэта аграгігант з самым вялікім пагалоўем статка ў нашай краіне, а яго трэба карміць — адзін з клопатаў раслінаводаў «Парахонскага». Час касавіцы тут — наогул стратэгічная пара, таму што ад яе наўпрост залежыць важны кірунак сельгаспрадпрыемства, на якім створаны і ўжо працуе новы сучасны комплекс па вытворчасці вітамінна-травяных гранул, якія ідуць на корм для жывёлы. Прыклад для іншых, як мадэрнізацыя і інавацыі ў сельскай гаспадарцы дапамагаюць чалавеку працаваць максімальна рацыянальна, захоўваючы пажыўнасць зялёнай масы на працягу года.

Высокапрадукцыйныя лініі для сушкі і гранулявання зялёнай масы — фактычна як уласны «камбікормавы завод», з новымі рабочымі месцамі для жыхароў аграгарадка Парахонск. Мэта, дзеля якой праект ажыццяўляўся, — палепшыць уласную кармавую базу прадпрыемства. Трава скошваецца, хутка высушваецца пры высокіх тэмпературах і спрэсоўваецца ў шчыльныя гранулы, якія выкарыстоўваюць як корм ці дабаўку да харчавання. Такім чынам да вядомых тэхналогій нарыхтоўкі сенажу і сіласу дадалася новая, што дазваляе максімальна захаваць бялок і ўсе карысныя для жывёл рэчывы, якія з'яўляюцца асновай збалансаванага рацыёну цягам усяго года, — такі корм захоўваецца доўга. Ці трэба тлумачыць, наколькі адказна ў гэтай гаспадарцы падыходзяць да касавіцы?..

— Мы спецыялізуемся на вытворчасці мяса і малака, таму ў раслінаводстве арыентуемся на патрэбы жывёлагадоўлі: трэба накарміць 26 000 галоў статка! Самі сябе забяспечваем зярном і кармамі, — гаворыць **намеснік дырэктара па раслінаводстве ААТ «Парахонскае» Аляксандр ПІКУН.** — Агульная плошча зямель гаспадаркі — больш за 26 000 гектараў, з іх каля 20 000 — сельгасугоддзі. Пры тым што глеба і ўмовы, у якіх мы працуем, складаныя: тарфянікі, а вясной бываюць пыльныя буры, з-за чаго губляецца торф, гэта абядняе зямлю. Наша задача — падтрымліваць яе ў прыдатным стане. І ў нас атрымліваецца заставацца сярод лідараў па нарыхтоўцы кармоў: у папярэднія гады мы і па тры ці чатыры ўкосы за сезон рабілі. Галоўнае — добра падрыхтаваць палі. Дзеля падтрымкі раслін ўносім фосфарныя і калійныя ўгнаенні, вясной падкармліваем азотнымі. Травы перыядычна падсяваем, звычайна ўвесну і летам пасля ўборкі. Сёлета на 5000 гектарах пасеялі кукурузу — яна ідзе на сілас ўмовы надвор'я, каб не дапусціць перастою траў. Косім, правяльваем, здрабняем, пасля трава страмбоўваецца. Пры скашванні дадаём цукровы сіроп для збалансаванага харчавання і жамерыны свежых буракоў, каб павысіць якасць корму. Нам штогод яго патрэбна 130 тысяч тон, гэта з запасам.

так — а гэта шэсць малочна-таварных і сем адкормачных комплексаў. Такім чынам да мінімуму зведзена залежнасць ад пакупных кампанентаў — усё сваё! Якасныя кармы спрыяюць павелічэнню надояў малака і прывазе мяса — гэта менавіта тое, чым славіцца Пінскі край.




**У Беларусі завяршылі сяўбу яравых культур, грэчкі, проса, бульбы і агародніны, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.**




**Паводле аператыўных даных на 1 чэрвеня, мінеральных угнаенняў пад яравую сяўбу назапашана 889 тыс. т дзейнага рэчыва (106 % да плана).**




**Скошана траў першым укосам на плошчы 479 тыс. га, што складае 34 % ад плана ў памеры 1,407 млн га.**




**Сенажу нарыхтавана 2,205 млн т — 15 % ад плана ў памеры 14,309 млн т.**




**Сіласу нарыхтавана 163 тыс. т (1 %), запланавана — 20,519 млн т.**




**Травяных кармоў нарыхтавана 654 тыс. т кармавых адзінак, што складае больш як 6 % ад плана ў памеры 10,131 млн т.**



Ларыса ЦІМОШЫК